# Прапануем прачытаць:

**1.** Навуменка, І. Вецер у соснах : Раман / І.Навуменка.- Мн. : Юнацтва, 1993

**2.** Навуменка, І. Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва : аповесці : для сярэд. і ст. шк. узросту / Іван Навуменка.- Мінск : Юнацтва, 2000

**3.** Навуменка, І. Летуценнік; Смутак белых начэй : Раманы / І.Навуменка.- Мн. : Маст. літ., 1985

**4.** Навуменка, І. Сасна пры дарозе : Раман / І.Навуменка.- Мн. : Юнацтва, 1991

**5.** Навуменка, І. Сорак трэці : Раман / І.Навуменка.- Мн. : Маст. літ., 1976

**6.** Навуменка, І. Хатняе зайчанё : Апавяданні / І.Навуменка.- Мн. : .Юнацтва, 1998.

**7.** Навуменка, І.Я. Гуканне над верасамі : аповесці, апавяданні : Для сяр. і ст. шк. узросту / Іван Навуменка.- Мінск : Маст. літ., 2002






















ДУК ”Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

# Майстар роднага слова



## Іван Якаўлевіч Навуменка

*16 лютага – 100 гадоў з дня нараджэння*

Докшыцы

2025

# Іван Якаўлевіч Навуменка

Нарадзіўся 16 лютага 1925 года ў горадзе Васілевічы Рэчыцкага раёна БССР у сям'і чыгуначнікаў.

Сям'я будучага пісьменніка жыла бедна, і з трэцяга класа бацька вадзіў сына на чыгунку. У 14 гадоў ён пачаў працаваць у рамонтнай брыгадзе.

Навуменка ўдзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне са студзеня 1942 года ў камсамольскім падполлі. Затым ваяваў у партызанах. У снежні 1943 года яго прызвалі ў Чырвоную армію.

У 1950 годзе завочна скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. А ў 1954 і аспірантуру пры ўніверсітэце.

З 1953 да 1958 года працаваў загадчыкам аддзела прозы літаратурнага часопіса ”Маладосць“, у 1954-1973 гадах – старшы выкладчык, дацэнт, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры БДУ. У 1973-1982 гадах – дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР.

Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 1985-1990 гадоў. Выконваў абавязкі Старшыні Вярхоўнага Савета. У 1992-2002 гадах – саветнік Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 2002 – галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры НАН Беларусі.

Памёр 17 снежня 2006 года.

## Творчасць Івана Навуменкі

Першыя вершы пісьменніка былі апублікаваны ў 1946 годзе ў раённай газеце. З прозай дэбютаваў апавяданнямі ў 1955 годзе ў часопісе ”Маладосць“.

Вельмі часта ў сваіх творах Навуменка падымае тэму моладзі ў час вайны. Першы зборнік пісьменніка, які выйшаў у 1957 годзе, называўся ”Сямнаццатай вясной“. Усяго ж у яго выйшла 11 зборнікаў апавяданняў і аповесцяў. Апошні, ”Водгулле далёкіх вёснаў“ – у 1989 годзе.

У пачатку творчасці пісьменнік у асноўным пісаў апавяданні.

Але пазней пачынае ствараць аповесці, раманы і п'есы.

Важнае значэнне ў творчасці Навуменкі займае трылогія: ”Сасна пры дарозе“ (1962), ”Вецер у соснах“ (1967), ”Сорак трэці“ (1974). Яна расказвае аб партызанскай барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў і носіць маштабны, гераічны характар.

Творы пісьменніка перакладзены на латышскую, балгарскую, нямецкую, рускую і іншыя мовы.

Акрамя літаратуры займаўся навуковай працай – даследаваў творчасць Максіма Багдановіча, Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Апублікаваў каля 200 навуковых прац, у тым ліку 10 манаграфій.

У 1981-1884 гадах выдадзены збор твораў пісьменніка, у які ўвайшлі ў тым ліку і вершы Навуменкі.